# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

11 траўня 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Андрэй Атаманчук, Алена Філатава, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька, Альвіна Мінгазава, Дзмітрый Лазавік.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сяброў Выбарчай камісіі прысутнічае – 6 чалавек. Кворум выкананы.

Пасяджэнне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

На пасяджэнні Выбарчай камісіі прысутнічаюць сябры Выбарчай камісіі з правам голасу, а таксама сябры сакратарыята Выбарчай камісіі, якія з'яўляюцца непублічнымі асобамі, аказваюць тэхнічную дапамогу Выбарчай камісіі, у тым ліку складаюць пратакол пасяджэння Выбарчай камісіі, аднак правам галасы не валодаюць.

**Парадак дня**:

1. Зацвярджэнне парадка дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 11 траўня 2024 года.
2. Абвестка прынятых у працоўным парадку рашэнняў. Выдаленне са спісаў па запытах.
3. Рашэнне па канчатковай канфігурацыі выбараў на платформе.
4. Разгляд змены лацінкі на кірыліцу ў спісе Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць” па запыце лідараў.
5. Дэкларацыя пазіцыі адносна заўваг.
6. Абвестка па незалежным назіральнікам.

**Разгляд пытання №1.**
Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 11 траўня 2024 года.

Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.
Па пытанні № 1 прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 11 траўня 2024 года.

**Разгляд пытання №2.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні Абвестка прынятых у працоўным парадку рашэнняў:

“У спісах кандыдатаў выбарчых суб'ектаў адбыліся наступныя змены: кандыдат выбарчага суб'екту "Независимые белорусы" Уладзіслаў Салавей, які быў у спісе пад нумарам 2, Мікалай Бойка пад нумарам 12, Андрэй Гаўрылюк пад нумарам 14 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай Камісіі ад 2 траўня 2024г. Падставай для гэтага выключэння стаў адпаведны зварот, які быў накіраваны ініцыятарам выбарчага суб'екта напярэдадні на адрас выбачай камісіі. Кандыдат выбарчага  суб'екта Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць” Цішкевіч Вольга пад нумарам 10 таксама была выключана са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай Камісіі ад 2 траўня 2024г. Падставай для гэтага выключэння стаў адпаведны зварот, які быў накіраваны ініцыятарам выбарчага суб'екта 2 траўня. Кандыдат са спісу выбарчага суб'екта Каманда Латушкі і Рух "За Свабоду" Алена Пуцыковіч пад нумарам 45 выключана са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай Камісіі ад 10 траўня 2024г. Падставай для гэтага выключэння стаў адпаведны зварот ад спадарыні Алены Пацуковіч ад 9 траўня 2024г. на адрас выбарчай камісіі. Кандыдат са спісу выбарчага суб'екта “Блок Пракоп’ева-Ягорава” Яраслаў Гамолка пад нумарам 32 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай Камісіі ад 10 траўня 2024г. Падставай для гэтага выключэння стаў адпаведны зварот, накіраваны ініцыятарам выбарчага суб'екта 9 траўня 2024г. на адрас выбарчай камісіі. Кандыдат спісу выбарчага суб'екта "Наша справа" Таццяна Шостак пад нумарам 11 выключана са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай Камісіі ад 11 траўня 2024г. Падставай для гэтага выключэння стаў адпаведны зварот ад кандыдата напярэдадні, 10 траўня 2024г. на адрас Выбарчай Камісіі.

Кандыдат спісу выбарчага суб'екта "Воля" Ігар Турцэвіч пад нумарам 5 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай Камісіі ад 11 траўня 2024г. і падставай для гэтага выключэння стаў адпаведны зварот, накіраваны самім кандыдатам 10 траўня на адрас выбарчай камісіі.
Сення пасля пасяджэння будуць апублікачаны адноўленыя спісы з улікам усіх прынятых рашэнняў”.

**Прагаласавалі:**
**"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.**
**ВЫРАШЫЛІ: Выдаленне са спісаў па запытах.**

**Разгляд пытання №3.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні рашэння па канчатковай канфігурацыі выбараў на платформе.
"Напчатку працы выбарчай камісіі патынцыйна існавала дзве опцыі для галасавання: опцыя праз адмыслова створаны камандай Паўла Лібера электронны дадатак, які спамуецца з Apple Store і Google Play, другая опцыя - опцыя галасавання праз телеграм-бот, які б верыфыківаў галасы адносна базе дадзеных, якая знаходзіцца ў сістэме "Голас". Выбарчая камісія ў працоўным парадку правяла некалькі працоўных пасяджэнняў па гэтым пытанні. Выбарчая камісія прыняла рашэнне пакінуць адну опцыю для галасавання - дадатак, які будзе трэба спамаваць з Apple Store і Google Play. На дадзены момант і да 20 траўня, гэты дадатак пакуль не выкладзены ні ў Apple Store , ні ў Google Play. Гэта зроблена адмыслова, у мэтах бяспекі, каб у рэжыма было як мага меньш магчымасцяў нашкодзіць альбо стварыць нейкі зяркальны дадатак ці штосьці яшчэ іншае.
20 траўня дадатак з'явіцца на Apple Store і Google Play. Ад панядзелка ў сродках масавай інфармацыі з'явіцца адмысловыя інструкцыі, як гэтым дадаткам карыстацца. Таму я заклікаю ўсіх прычэпных дакладна вывучаць гэтыя інструкцыі. Таксама я хочу звярнуць увагу ўсіх удзельнікаў гэтага электаральнага цыклу, штобы вы карысталіся толькі інфармацыяй з адпаведных афіцыйных крыніцаў, з паведамленняў са старонак Каардынацыйнай Рады альбо ў сродках масавай інфармацый, якія Каардынацыйная Рада будзе верыфікаваць як партнерскія. Усе спасылкі на спамоўкі гэтых дадаткаў альбо спасылкі на інструкцыі будуць выкладацца менавіта там. Таму , калі ласка, правярайце інфармацыю адкуль вам

прыйшла спасылка, хто вас да чаго заклікае, адкуль вы што спамуеце - карыстайцеся толькі выключна афіцыйнымі спасылкамі, выкладзенымі ў афіцыйных каналах. Нагадаю: з 25 па 27 траўня адбудзецца само галасаванне праз гэты дадатак, і ўжо пасля, 28-га траўня будуць абвешчаны вынікі і размеркаваны квоты альбо мандаты па сродкам метада Хэра – Німейера.
Для тых, хто знаходзіцца ў Беларусі, будзе адпавердная інструкцыя, як выдаліць дадатак і не пакінуць пасля сябе ніякіх лічбавых слядоў. Вы спамуеце дадатак, у ім жа вы прагаласуцец, выдаліце і ніякіх слядоў не пакінеце. Вы не перасылаеце праз дадатак свае асабістыя дадзеныя, яны захоўваюцца, застаюцца ў вас на тэлефоне. Калі вы пакідаеце дадатак, яны застаюцца з вамі там, калі вы выдаляеце - яны выдаляюцца адпаведна. Мы атрымліваем ад вас толькі закадзіраванную інфармацыю, хэшыраваную інфармацыю вашых персанальных звестак, якую немагчыма раскадзіраваць, і ніякім чынам паўплываць на чалавека, які гэтыя дадзеныя адправіў ці выкарыстаць гэты набор лічбаў супраць гэтага чалавека".

Галасаванне па пытанні рашэння па канчатковай канфігурацыі выбараў на платформе:
**Прагаласавалі:**
**"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.**
**ВЫРАШЫЛІ: Прыняць дадатак як канчатковую канфігурацыю выбараў, які з'яўляецца максімальна бяспечным для карыстальнікаў.**

*Заўвага па пытанню ад Дзмітрыя Лазавіка:* "На тэрыторыі Беларусі трэба абавязкова выкарыстовываць VPN".
*Алена Прыходзька*: "На тэроторыі Беларусі мы раім адразу выдаляць і не захоўваць гэтую прыладу ў сябе ў тэлефоне".

**Разгляд пытання №4.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні разгляду змены лацінкі на кірыліцу ў спісе Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць” па запыце лідараў.
"Разглядаем зварот ад спісу Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" “Салідарнасць” унесці

змены ў напісанне прозвішчаў у спіс, удакладню не ў сам спіс, не ў парадак, не змяніць асобаў, а проста дадаць да напісання, таму што зараз яно лацінкай, дадаць яшчэ кірылічную транскрыцыю прозвішчаў чальцоў гэтага спіса.

**Прагаласавалі:**
**"За" - 5 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 1 голас.**
**ВЫРАШЫЛІ: унесці змены ў напісанне прозвішчаў у спіс Аб’яднанне палітычных партый "Народная Грамада" і "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя".**

**Разгляд пытання №5. Дэкларацыя пазіцыі адносна заўваг**
Алена Прыходзька: "Выбарчая камісія звяртаецца да ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу з заклікам прытрымлівацца прынцыпаў здаровай канкурэнцыі і не ўжываць брудныя сродкі ўздзяння на грамадскае меркаванне. Таксама мы звяртаемся за саміх выбаршчыкаў з заклікам крытычна ставіцца да інфармацыі, правяраць яе, атрымліваць з розных крыніц, і ўсялякія апытанкі, рэйтынгі, параўнальныя вынікі не ўспрымаць як канчатковыя альбо сапраўдныя экзітполы".

**Разгляд пытання №6.**
СЛУХАЛІ: Яраслаў Бекіш па пытанні запрашэння незалежных назіральнікаў да ўдзелу ў выбарчай кампаніі.
"У нас ўжо на сення есць запыты і камунікацыі ад еўрапейскіх назіральнікаў, якія б хацелі прыняць удзел, таксама есць запыты ад прадстаўнікоў выбарчых суб'ектаў, якія б хацелі накіраваць сваіх назіральнікаў за гэтымі выбарамі. У нас няма абмежаванняў, каго дапускаць, каго не дапускаць, таму калі есць прапановы да каго звярнуцца альбо цалкам якія-небудзь заўвагі, то давайце зараз абмяркуем гэта."
Яраслаў Бекіш: "Мне падаецца, што мы як выбарчая камісія зацікаўлены ў тым, каб гэтая працэдура выбараў была максімальна празрыстай. Гэтую празрыстасць могуць забяспечцыь не толькі чальцы выбарчай камісіі, але і незалежныя назіральнікі. Па-першае, гэта прадстаўнікі краін. У нас ужо есць запыты прадстаўнікоў дзяржаўных структур краін, якія ўходзяць у склад Еўрапейскага Звязу. Незалежнымі назіральнікамі могуць быць прадстаўнікі грамадзянскіх супольнасцяў таксама розных краін, уключаючы Беларусь. Медыя ў данным выпадку могуць асвяшчаць гэты

працэс, не валодая пры гэтым статуса назіральніка. З боку выбарчай камісіі мы павінны распрацаваць афіцыйны зварот да прадстаўнікоў усіх краін, якія мы лічым дэмакратычнымі для таго, каб яны маглі даслаць сваіх прадстаўнікоў. Гэта могуць быць розныя дзяржаўныя органы, парламенты, урады, а таксама паспрыяць таму, каб прадстаўнікі грамадзянскіх супольнасцяў розных краін маглі назіраць за гэтым працэсам. Назіранне магчыма нашых паседжанні, працэс галасавання, дакументаабарот. Было б карэктна з нашага боку распаўдзіць такое запрашэнне па парламентах усіх краін і паглядзець, хто пагадзіцца. Я бы зрабіў і асобны фокус на такія структуры як Еўрапейскі Звяз, направіць запрашэнне да Еўрапейскай Камісіі, і асобную ўвагу звярнуў бы на такую структуру як Еўранэст (Парламенцкая вымеранне Усходняга партнерству).Такі ліст накіраваў бы і адразу бы патлумачыў у якой форме гэта назіранне можа прахадзіць і чаго мы са свайго боку чакаем ад тых, хто будзе назіраць. Я бы казаў пра запрашэнне прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці нашага рэгіену, калі будуць звароты з іншых рэгіенаў, мы можам разглядаць, але я б казаў пра форум грамадзянскай супольнасці Усходняга партнерства. Ва Усходнім партнерстве апроч Беларусі яшчэ пять краін, і я б звярнуўся праз Беларускую нацыянальную платформу да астатніх нацыянальных платформаў, каб папрасіць назіральнікаў ад іх. У запрашэнні б адразу патлумачыў, што ў нас няма ніякага бюджэту таму гэтае назіранне прапануем у тых формах, якія можам прапанаваць, і яны самі могуць вырашыць ці ім гэта цікава, ці есць у ніх такая магчымасць".

**Прагаласавалі:**
**"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў**
**ВЫРАШЫЛІ: да панядзелка распрацаваць запрашэнне, у працоўным парадку вынесці разгляд прапановы.**

Пасяджэнне абвешчана закрытым.